Мікола
Ермаловіч

Старажытная Беларусь

Віленскі перыяд

Мінск
Выдавецкі цэнтр
«Бацькаўшчына»
МП «Бесядзь»
1994

ББК 63.3 (4Бел)43
Е 72
УДК 947.6 «13»

Ермаловіч М.

Е 72 Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд.— Гіст. дасл. Мн.: Выд. цэнтр «Бацькаўшчына»: МП «Бесядзь», 1994.— 91 с.

ISBN 985-6026-01-6.

Гістарычны нарыс Міколы Ермаловіча з'яўляецца працягам кнігі «Старажытная Беларусь. Полацкі і Новагародскі перыяды», якая была адзначана Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь і Літаратурнай прэміяй імя Кастуся Каліноўскага і заваявала трывалую папулярнасць у чытачоў. У новай кнізе аўтар вядзе гаворку пра Віленскі перыяд старабеларускай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага.

М. Ермаловіч працягвае сваю надзвычай каштоўную для асэнсавання нашай мінуўшчыны працу.

Е 9470600000 ББК 63.3(4Беи)43

ISBN 985-6026-01-6

Вільня

Калі папярэдні Новагародскі перыяд з'яўляўся часам станаўлення і ўмацавання Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ), то наступны — Віленскі, які таксама быў нядоўгім, бо працягваўся менш стагоддзя (з 1316-га да 1385 г.), быў часам бурнага тэрытарыяльнага росту гэтай беларускай дзяржавы, што і вывела яе ў лік найбуйнейшых тагачасных еўрапейскіх краін.

Мы ўжо гаварылі аб прычынах страты Новагародкам свайго сталічнага значэння[1]. Але побач з упадкам дамінуючага значэння яго і яго зямлі ў дзяржаве ішло ўзвышэнне Полацкага княства. Праўда, сталіца з Новагародка не «перайшла» ў сам Полацк, аднак яна зноў перамясцілася ў крывіцкую зямлю, у Вільню, якая была галоўным асяродкам племя крывічоў на ўсходзе сучаснай Літвы і, як убачым далей, стала цэнтрам аднаго з удзелаў Полацкага княства.

Што ж уяўляла сабой тады Вільня? Чаму менавіта яна стала пераемніцай Новагародка як сталіцы дзяржавы?

Найперш — пра ўзнікненне гэтага горада.

У летапісах XVI ст. вельмі маляўніча гаворыцца аб заснаванні Вільні Гедзімінам*.

Нібыта гэты князь, будучы на паляванні, натрапіў на прыгожую гару над ракою Вяллёю, дзе забіў тура, і таму яна ў далейшым стала называцца Туравай гарой. Паколькі было позна, Гедзімін вырашыў не вяртацца дадому ў Трокі, спыніўся ў даліне Свентарога, дзе пазней

* У беларускай навуковай літаратуры імя гэтага вялікага князя літоўскага традыцыйна ўжываецца ў форме «Гедымін», аднак Мікола Ермаловіч настойвае на сваёй форме, даючы гэтаму пэўныя абгрунтаванні. *(Заўвага рэд.)*

вялікіх князёў спальвалі пасля смерці, і там заначаваў. І прысніўся яму сон, што на гары, якую звалі Крывою, а цяпер завуць Лысаю, стаіць вялікі жалезны воўк, і ў ім равуць сто ваўкоў. І калі Гедзімін, прачнуўшыся, звярнуўся да валхва Ліздзейкі, каб ён разгадаў гэты сон, дык той сказаў: «Жалезны воўк азначае, што тут будзе сталіца, а што ў яго ўнутры раўло, то гэта слава аб гэтым горадзе, якая пойдзе на ўвесь свет». І вось Гедзімін, пачуўшы такое, адразу ж загадаў прывесці сюды людзей, каб закласці замкі, адзін на Свентарозе — Ніжні, і другі — на Крывой гары, і назваў гэтыя замкі Вільняй[2].

Вядома ж, перад намі легендарнае асэнсаванне ўзнікнення Вільні, тым больш што перад гэтым нешта падобнае гаварылася аб збудаванні Трокаў.

Археалагічныя ж дадзеныя сведчаць, што Вільня ўзнікла не ў XIV ст., а значна раней. Як паказалі даследаванні В. і Е. Галубовічаў (на жаль, цяпер яны чамусьці замоўчваюцца некаторымі даследчыкамі), Вільня была заснавана крывічамі[3]. Як адзначалася намі раней, пры разглядзе славянскага засялення Беларусі, крывічы рухаліся з захаду па Нёмане і яго прытоках, таму з'яўленне іх на Вяллі і заснаванне імі тут горада не было выпадковым. Менавіта гара, якая спачатку называлася Крывой, а пасля — Лысай, і стала месцам, дзе пачаткова аселі крывічы. Пасля яны залажылі тут горад, які стаў называцца Крывіч-горадам (пазней — Крывым Горадам) і стаў адной са сталіц гэтага племя. Археалагічныя матэрыялы паказваюць, што паселішча, якое існавала на гэтай гары, было знішчана агнём у VII ст. н. э. І калі да таго часу кераміка і іншыя рэчы былі тут тыпова балцкімі, то пасля яны знікаюць і замяняюцца керамікай, характэрнай для славянскіх магільнікаў[4].

Як вядома, у VII ст. ішло славянскае засяленне тэрыторыі сучаснай Беларусі і ўсходняй часткі Літвы. Несумненна, што крывічы і знішчылі гэта балцкае паселішча, а на яго месцы заснавалі сваё, якое пазней і вырасла ў горад. Моцная, відаць, калонія крывічоў, пасяліўшыся тут, як убачым далей, не мірным шляхам, пачала ўмацоўвацца сярод балцкага насельніцтва, паступова асімілюючы яго і ператвараючы ў славянскае. Пра тое, што гэтае паселішча спачатку называлася Крывіч-горадам, сведчыць яго назва і ў нямецкіх хроніках — Крывічкаструм (Крывіцкая крэпасць), і ў літоўскай мове — «Крэйвепіліс»[5]. Аб славянскім паходжанні Вільні разам з яе назваю сведчаць і назвы гор, дзе яна пачаткова размяшчалася, і назвы замкаў і нават назва ракі (яна завецца не Нярысам, а Вяллёй, як называюць яе і сёння тутэйшыя беларусы). Невыпадкова таму нямецкі храніст XIV ст. Віганд Марбургскі і называў Вільню рускім горадам[6].

Усе гэтыя факты як найлепш адмятаюць спробы некаторых сучасных даследчыкаў прымяншыць або нават і зусім паставіць пад сумненне факт з'яўлення ў гэтым рэгіёне славянаў[7]. Менавіта славянская каланізацыя мела тут першаступеннае значэнне, у выніку чаго Вільня ўжо ў XIV ст. мела ўсе рысы славянскага горада. Вядома, гэта не адмаўляе таго, што тут жыло і іншапляменнае насельніцтва, у тым ліку і язычніцкае, якое ў літаратуры звычайна атаясамліваецца толькі з балтамі.

У сувязі з гэтым хочацца звярнуць увагу на такі факт. З 40-х гадоў XIV ст. захавалася гісторыя аб трох віленскіх пакутніках, якія перайшлі з язычніцтва ў хрысціянства, за што і паплаціліся жыццём. Тут асабліва цікава тое, што да прыняцця хрысціянства гэтыя асобы насілі яўна славянскія імёны — Кумец, Круглец, Няжыла. А гэта можа сведчыць, што язычнікамі ў той час маглі быць не толькі балты, але і славяне, найперш крывічы. Жывучы ў Вільні і ў яе наваколлі, яны былі адрэзаныя ад такіх буйных хрысціянскіх цэнтраў, як Полацк і Тураў, і маглі яшчэ доўга, як і балты, заставацца язычнікамі. Усё гэта трэба было ўлічваць, каб не перабольшваць значэння балтаў, якія звычайна толькі і атаясамліваюцца з язычнікамі ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага.

Як бачым, Вільня з'яўляецца спрадвечным беларускім горадам, і таму зразумела, што перанясенне туды сталіцы з Навагародка не толькі не магло паўплываць на беларускі характар Княства, але яшчэ больш падкрэслівала яго. Зрабіўшыся сталіцай, Вільня, як крывіцкі горад, яшчэ больш садзейнічала беларускай каланізацыі балцкіх земляў і асіміляцыі іх насельніцтва.

Аднак, менавіта з гэтага часу пачалі складвацца ўмовы для ўзнікнення погляду на Вялікае княства Лі-

тоўскае як дзяржавы літоўскай (у сучасным значэнні гэтага слова), дзе славянскія землі былі заваяваны літоўскімі князямі і знаходзіліся ў іх падначаленні. Рэч у тым, што ў сувязі з перанясеннем сталіцы з Навагародка ў Вільню і назва «Літва» пачала паступова пераходзіць з Верхняга Панямоння на ўсход сучаснай Літвы, выцясняючы адтуль старую назву «Аўкштайцію». Тым не менш у XIV ст. аўкштайцкія землі яшчэ не атаясамліваліся з Літвой. Гэта пацвердзіў нямецкі храніст П. Дусбург, які, гаворачы аб падзеях 1294—1300 гг., называў Аўкштайцію «уладаннем караля Літвы»[8]. Тое самае мы бачым і ў грамаце Гедзіміна ад 2 кастрычніка 1323 г. Ужо тое, што гэты князь, называючы сябе каралём Літвы, палічыў патрэбным у ліку іншых земляў, ад імя якіх ён заключыў мір, назваць і Аўкштайцію, гаворыць пра яе агульнавядомае ў той час найменне і пра тое, што тытул караля Літвы паходзіць не адсюль[9]. Наколькі доўга трымалася тут гэта назва, сведчыць яе ўжыванне Вітаўтам у 1422 г.[10]. Аднак, хоць і паступова, але назва «Літва» — найперш пад уплывам знаходжання тут сталічнай Вільні — замацоўвацца ў Аўкштайціі, выцесніўшы адтуль ранейшае найменне. Новая назва пачала ўспрымацца тут як адвечная, што і прывяло да атаясамлівання гэтай Літвы са старажытнай, і тым самым унесла, як мы ведаем, выключна вялікую блытаніну ў поглядзе на ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага, выводзячы вытокі гэтай дзяржавы з тэрыторыі сучаснай Літвы, а не з Верхняга Панямоння, як было ў сапраўднасці.

Археалагічныя матэрыялы паказваюць, што Вільня да пачатку XIV ст. развілася ў такое значнае паселішча, што Гедзімін палічыў патрэбным перанесці сюды сталіцу дзяржавы.

Якога яны роду?

Паколькі Гедзімін лічыцца цэнтральнай постаццю ў родзе вялікіх князёў літоўскіх, якія, пачынаючы з XIV ст., называліся Гедзімінавічамі, варта яшчэ раз звярнуцца да пытання аб паходжанні гэтай дынастыі.

Паводле падання, якое з'явілася яшчэ ў XV ст. (упершыню яно зарэгістравана ў Я. Длугаша), вялікія літоўскія князі і знакамітыя літоўскія роды паходзяць ад славутых рымлянаў, што, ратуючыся ад Нерона, прыплылі ў вусце Нёмана і пачалі прасоўвацца па гэтай рацэ далей[11]. Мэтаю такой версіі было паказаць больш слыннае і даўняе паходжанне літоўскай знаці ў параўнанні з польскаю, якая пасля Крэўскай уніі ўсё больш настойліва імкнулася падначаліць сабе Вялікае княства Літоўскае. Унесеная Я. Длугашам і асабліва М. Стрыйкоўскім у іх творы, гэта легенда пашырылася ў гістарычнай літаратуры, нярэдка выдавалася за праўду. Вядома ж, Гедзімін, як і іншыя літоўскія князі, лічыўся нашчадкам знакамітых рымлянаў.

Але зусім інакш падаецца паходжанне вялікіх літоўскіх князёў у некаторых рускіх летапісах. Апавяданне пра гэта пачынаецца з падзей 1129 г., калі кіеўскі князь Мсціслаў Уладзіміравіч захапіў Полацк, а полацкія князі Рагвалодавічы (маецца на ўвазе прыналежнасць да гэтага роду полацкіх князёў) былі забраныя ў палон і высланыя ў Царград. Літва ж у той час даніну давала князям полацкім, а «владома своими гедманы». Але калі полацкія князі былі высланыя, «вильняне приложися дань давати королю Угорскому за страхование великого князя Мстислава Владимировича», а таксама «взяша собе по Царяграда князя Полотского Ростислава Рогволодовича детей: Давила-князя да брата его Мовкольда-князя»[12].

Гісторык У. Пашута цалкам адмаўляў праўдзівасць такога паказу генеалогіі вялікіх літоўскіх князёў, называючы яго тэндэнцыйна апрацаванай версіяй на карысць Масквы. У той жа час ён лічыў вартым увагі і даверу ўпамінанне гэтым летапісам сына полацкага князя Гердзеня — Андрэя (які быў цвярскім епіскапам), бо гэта паказвае на раннія культурныя сувязі Цверы і Літвы[13]. Незразумела, пры чым тут Літва, калі Гердзень і яго сын Андрэй не мелі да яе ніякага дачынення. Ды ўжо такая ў гэтага аўтара тэндэнцыя — усімі сродкамі ўзвышаць Літву і зацямняць ёю Беларусь.

Але хіба толькі гэта — адзіна праўдзівы факт у выкладзенай вышэй гісторыі? А тое, што Мсціслаў Уладзіміравіч захапіў у 1129 г. Полацк, у выніку чаго полацкія князі апынуліся ў Візантыі, хіба супярэчыць гістарыч-

най праўдзе? Гэтаксама як і тое, што Літва давала даніну Полацку, але знаходзілася ў кіраванні сваіх князёў-«гедманаў» і пасля захопу ў палон полацкіх князёў, страціўшы сваіх апекуноў, павінна была шукаць іншых абаронцаў, каб страхавацца ад нападу Мсціслава Уладзіміравіча. Гэта бясспрэчны факт, бо Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі летапісы засведчылі паходы гэтага князя пасля ўзяцця Полацка на Літву ў 1130 і 1131 гг.[14]. Праўда, застаецца незразумелым, чаму «вильняне» звярнуліся па дапамогу да ўгорскага (венгерскага) караля і сталі даваць яму даніну. Угоршчына не межавала з Літвою і наогул была ад яе далёка. І ўсё ж, відаць, угры абаранялі Вільню, бо адкуль маглі з'явіцца ў гэтым горадзе горы Угры, якія ўпамінаюцца ў летапісе. У ім хаваўся князь Яўнуд у 1345 г., ратуючыся ад сваіх братоў Кейстута і Альгерда[15]. Відаць, на гэтых гарах і размяшчалася ўгорскае войска, каб бараніць Вільню. Такім чынам, і гэты факт мае пад сабою падставы.

Але самае галоўнае для нас у гэтым летапісным апавяданні — паведамленне аб узяцці вільнянамі з Царграду сыноў высланага з іншымі полацкімі князямі Расціслава — Давіла і Маўкольда. Менавіта ад гэтых двух полацкіх князёў і пачынаецца ўласна дынастыя вялікіх князёў літоўскіх: ад першага з іх князі Від і астатнія, ад другога — Міндоўг. Тое, што такое магло адбыцца, зусім заканамерна. Вільняне, як мы ўжо ведаем, у большасці былі крывічамі, і ўвесь час знаходзіліся ў залежнасці ад полацкіх князёў, бачачы ў іх асобе сваіх законных гаспадароў. Гэта пацвярджаецца і фактам, які данеслі да нас польскія крыніцы: каля 1070 г. у Вільні сядзеў полацкі князь Расціслаў Рагвалодавіч[16], і таму невыпадкова вільняне ўзялі яго сыноў да сябе. Гэта яшчэ адно пацвярджэнне праўдзівасці Васкрасенскага летапісу. Такім чынам, ужо з 70-х гадоў XI ст. можна гаварыць аб існаванні Віленскага ўдзелу ў Полацкім княстве.

Праўда, трохі здзіўляюць імёны Расціслававых сыноў Давіла і Маўкольда — такія нетыповыя і нетрадыцыйныя для полацкай дынастыі. Аднак не выключана, што сапраўдныя іх імёны былі зменены з мэтаю скрыць іх полацкае паходжанне. Раней, пры асвятленні падзей 1129—1132 гг., намі адзначалася магчымасць таго, што не ўсе полацкія князі былі схопленыя і вывезеныя

ў Візантыю, а некаторыя з іх ураталіся ад палону, знайшоўшы прытулак у суседняй Літве. На гэта ўказвае хоць бы прыклад з Васількам Святаслававічам, які адразу ж пасля выгнання з Полацка ў 1132 г. кіеўскага стаўленіка Святаполка займае княжацкі пасад. Зразумела, што вярнуцца з Візантыі так хутка ён не мог, а значыць, дзесьці хаваўся — найверагодней, у Літве. Не выключана, што адной з мэтаў Мсціслававых паходаў на яе быў таксама і захоп полацкіх князёў, якія знайшлі там сабе прыстанак.

Аб тым, што Давіл і Маўкольд не былі выдуманымі асобамі, сведчыць той факт, што яны выступаюць тут удвух. Наўрад ці фальсіфікатару спатрэбілася б такое ўскладненне. Вельмі паказальны момант — ад Давіла выводзяцца ўсе вялікія літоўскія князі, пачынаючы ад Віда і Трайдзеня (ён названы тут Траенем) і канчаючы Гедзімінам і яго нашчадкамі, а ад Маўкольда толькі Міндоўг і яго сыны Войшалк і Доўмант (ён названы памылкова). Такім чынам, Міндоўг і Войшалк таксама паходзілі ад полацкай дынастыі. Цяпер становіцца зразумелым, чаму пасля смерці Войшалка, а за ім і Шварна, вялікакняскі пасад займаў Від, а пасля Трайдзень, бо са смерцю Войшалка абрывалася дынастычная лінія Маўкольда і таму законнымі пераемнікамі яе сталі нашчадкі Давіла. Найбольш праблематычнай з'яўляецца асоба сына Давіла — Віда. Рэч у тым, што ён больш нідзе ў летапісах, гэтак жа, як Давіл і Маўкольд, не ўпамінаецца. І ўсё ж гэта не дае падставы, каб адмаўляць яго гістарычную сапраўднасць. Па-першае, у летапісе ўказана такая яго індывідуальная рыса — як тое, што людзі яго Воўкам звалі. Гэту мянушку ён, відаць, заслужыў за свой няўрымслівы характар. Па-другое, у летапісе падкрэслены галоўны вынік яго дзейнасці, а менавіта тое, што ён далучыў да дзяржавы Дзярэўскую (г. зн. драўлянскую) зямлю. Гэта самае адзначана і ў адносінах да Трайдзеня, які далучыў Яцьвяжскую зямлю, і ў адносінах да Віценя, які пашырыў межы дзяржавы да Буга, што сапраўды было[17]. Сказанае вышэй можа сведчыць, што складальнік летапісу не аперыраваў выдуманымі асобамі і не прыпісваў ім уяўных дзеянняў, а чэрпаў гэтыя звесткі з пэўных крыніц, якія не дайшлі да нас. Калі мы гаварылі пра Трайдзеня, то ўказвалі, што засталося невядомым, хто быў вялікім

літоўскім князем пасля смерці Шварна ў 1268 г. і да пачатку княявання Трайдзеня[18]. Дык вось у гэтым прамежку па ўсяму відаць і ўладарыў Від.

Усё адзначанае змушае нас не сумнявацца ў гістарычнай праўдзівасці гэтай асобы, якая фактычна і стала родапачальнікам дынастыі вялікіх літоўскіх князёў, што, відавочна, паходзіць ад полацкай дынастыі.

Хто ён, Гедзімін?

Хаця пра Гедзіміна і яго дзейнасць да нас дайшло параўнальна больш звестак, чым пра яго папярэднікаў на вялікакняскім пасадзе, аднак і гэтыя дадзеныя далёка няпоўныя, некаторыя з іх супярэчлівыя, зацемненыя або зусім легендарныя, (напрыклад, у выпадку з заснаваннем Вільні). Апроч таго, і ў навуковых даследаваннях застаўся шэраг недастаткова, або аднабакова асветленых момантаў дзейнасці Гедзіміна. Гэта і прымушае нас да асабліва ўважлівага разгляду адпаведных матэрыялаў.

Найперш — пра імя. У беларускай навуковай літаратуры яно ўжываецца ў форме «Гедымін», аднак ці з'яўляецца такое напісанне правільным? Зазначым, што ў крыніцах яно існуе ў розных варыянтах. Гедимин, Кедмин, Кгиндимин, Кредимин, Скиндимин, Gedimin, Gedimont, Giedymin[19]. Як бачым, усюды ў іх (у тым ліку і ў напісаных лацінкай), гук «д» вымаўляецца як мяккі. Праўда, у «Хроніцы Быхаўца» бачым «Gedymin», але тут «у» чытаецца як «і». Таму ў беларускай мове гэтае імя павінна вымаўляцца і пісацца ў форме «Гедзімін».

У гістарычных крыніцах мы нідзе не знаходзім формы «Гедымінас». І гэта відавочна закрэслівае спробы шэрагу даследчыкаў гэту форму імя Гедзіміна паказваць як пачатковую і сапраўдную. У свой час В. Юргевіч на аснове філалагічнага матэрыялу і зыходзячы з аналізу іншых форм імя Гедзіміна, паказаў, што яно, як і імёны іншых вялікіх літоўскіх князёў, славянскага паходжання. Што падобнае імя існавала ва ўсходніх славян, сведчыць назва вёскі «Едимоново» ў Цвярскім

павеце[20]. В. Юргевіч адначасова адзначыў недарэчнасць спробаў некаторых літоўскіх даследчыкаў тлумачыць імёны літоўскіх князёў, у тым ліку і Гедзіміна, на аснове літоўскай мовы.

Вельмі заблытаным з'яўляецца і пытанне, кім быў Гедзімін у адносінах да Віценя. Яшчэ ў Я. Длугаша гаварылася, што Гедзімін быў конюхам Віценя і забіў яго, змовіўшыся з жонкаю апошняга, а пасля захапіў ягоны вялікакняскі пасад. Гэтая чутка была пушчана з крыжацкага асяроддзя, каб тым самым паказаць нізкае паходжанне вялікіх літоўскіх князёў, што абражала ў той час у вачах свету ўсю дзяржаву, з якой Ордэн нязменна знаходзіўся ў варожых адносінах. Ахвотна падхапілі гэтую чутку пазней у Польшчы і ў Маскве, якія — кожная з свайго роду — імкнуліся падначаліць сабе Вялікае княства Літоўскае.

Пэўны час у гісторыкаў не было сумневу, што Гедзімін з'яўляўся сынам Віценя, як пра гэта сведчаць «Хроніка Быхаўца» і падобныя ёй летапісы[21]. Але надрукаваная ў 1867 г. грамата магістрата горада Рыгі[22] пераканаўча абвергла карыслівую выдумку аб нізкім паходжанні Гедзіміна. Праўда, адначасова названая грамата несла і новую праблему. У гэтым дакуменце Гедзімін называўся братам свайго папярэдніка Віценя, што і прынялі многія даследчыкі. Але яшчэ В. Васілеўскі паказаў, што слова «frater» (брат) і «pater» (бацька) вельмі падобныя сваім напісаннем і могуць выглядаць амаль аднолькава[23]. Мы лічым больш абгрунтаваным тое, што Гедзімін быў сынам Віценя. Мала верагодна, каб брат перажыў другога брата на 25 гадоў, прычым, улічваючы, што Гедзімін памёр не сваёй смерцю, г. зн., мог яшчэ пэўны час жыць. І яшчэ трэба ўлічыць, што сярод князёў быў звычай, нягледзячы на ступень сваяцтва (ці нават пры яго адсутнасці), называць адзін аднаго братам. Так, напрыклад, Альгерд называў сваім братам нават маскоўскага князя Дзмітрыя Данскога[24], хаця яны ніякімі сваякамі не былі. Усё адзначанае можа закрэсліваць і сведчанні рыжскага дакумента пра Гедзіміна як брата Віценя.

Не менш складанае і пытанне, калі і дзе стаў Гедзімін вялікім князем. Як правіла, сцвярджаецца, што ён заняў вялікакняскі пасад у 1316 г. Аднак нідзе ў крыніцах гэтая дата не пацвярджаецца, як не пацвярджаецца

і дата смерці Віценя, пра якога ў пазнейшых летапісах сказана, што ён памёр ад удару перуна[25]. На карысць 1316 г. як даты смерці Віценя можа сведчыць тое, што гэты князь у 1314 г. абараняў Гародню ад крыжакоў, а ў 1315 г. узяў у аблогу іх замак Хрыстмемель[26]. Але трэба згадаць і іншыя даты пачатку кіравання Гедзіміна, што маюцца ў паасобных крыніцах. Так, у адной з іх сказана, што «в лето 6813 (1305) нача княжити Кгедимин Витуновичь в Литве, в Новогородку и Кернове»[27]. Мы яшчэ звернемся да гэтага запісу, а зараз толькі адзначым, што калі паводле яго княжанне Гедзіміна пачалося значна раней, то ў «Хроніцы Літоўскай і Жмойцкай» гэта падзея аднесена на пазнейшую дату — на 1321 г.[28]. Заўважым таксама, што гісторык В. Васільеўскі лічыў пачаткам княжання Гедзіміна 1320 г.[29]. На жаль, ён не ўказаў, чым у сваім меркаванні кіраваўся, аднак, як мы ўбачым далей, прапанаваная В. Васілеўскім дата, магчыма, найбольш дакладная.

Наконт таго, дзе пачаў княжыць Гедзімін, у «Хроніцы Быхаўца» і ёй падобных крыніцах, названы Кернаў[30]. Гэта як быццам пацвярджае і згаданы намі летапісны ўрывак аб тым, што «Кгедимин нача княжити... в Литве, в Новогородку и Кернове» гэты факт паказвае, што назва «Літва» яшчэ не пашыралася на ўсход сучаснай Літвы, дзе знаходзіўся Кернаў, які таму і названы асобна. Але сведчанні адзначаных крыніц аб Кернаве, як сталіцы дзяржавы пасля Новагародку, не пацвярджаюцца граматай Гедзіміна ад 25 студзеня 1323 г. У ёй у ліку іншага гаворыцца аб пабудове Гедзімінам каталіцкіх храмаў. «Няхай будзе вам вядома, што мы два гады назад (у 1321 г.) у нашым горадзе Вільні ўноў пабудавалі адну царкву Ордэна прапаведнікаў, а таксама цэрквы Ордэна мінарытаў у вышэйупомненым намі горадзе Вільні адну, у Новагародку — другую, якую спалілі прускія крыжакі... і якую ў тым жа годзе мы загадалі аднавіць уноў»[31]. Як бачым, тут упамінаюцца два гарады — Вільня і Новагародак, адзін з якіх — новая сталіца, другі — старая. Відавочна, што калі б сталіцай Гедзіміна быў Кернаў, то там бы перш за ўсё і будаваліся храмы, аднак гэта не адзначана, што можа адмаўляць сталічнае значэнне Кернава. Усё гэта дазваляе лічыць, што менавіта Гедзімін перанёс сталіцу

Вялікага княства Літоўскага з Новагародка ў Вільню.

Некаторыя іншыя спрэчныя пытанні, звязаныя з асобаю Гедзіміна, мы закранем, разглядаючы яго дзейнасць.

Дзе мірна, а дзе пад прымусам

Як у адносінах да асобы Гедзіміна, так і ў адносінах да ягонай дзяржаўнай дзейнасці маецца шэраг цёмных мест. Яшчэ В. Антановіч у свой час слушна заўважыў, што з прычыны няяснасці датаў уваходжання паасобных земляў у склад Вялікага княства Літоўскага многае з гэтага адносілася да часоў Гедзіміна[32]. Таму ў гістарычнай навуцы пануе думка, што і тады ішло далейшае падначаленне нібыта аслабелых і таму безабаронных беларускіх земляў узмацнелай літоўскай дзяржаве. Аднак, як і раней, так і за часамі Гедзіміна, нічога гэтага не было, а ішло далейшае эканамічнае, палітычнае і культурна-этнічнае збліжэнне і аб'яднанне беларускіх земляў.

Паколькі Беларусь не ведала татарскага нашэсця і яе эканамічныя і культурныя цэнтры не былі разбураны, адзначаны працэс тут адбываўся хутчэй, чым у рускіх і ўкраінскіх землях, дзе ён быў перарваны татарскаю навалай. Вось чаму пашырэнне тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ішло шляхам аб'яднання беларускіх земляў, якое адбывалася мірна. І таму мы не можам указаць дакладна, якая з іх і калі стала часткаю Вялікага княства Літоўскага. Можна толькі меркаваць, што ў час уладарання Гедзіміна ў склад дзяржавы ўвайшла Менская зямля, паколькі яе князь у 1326 г. разам з полацкім князем быў у складзе пасольства, якое ездзіла ў Ноўгарад. Па ўсяму відаць, што да Вялікага княства Літоўскага ў гэты час далучылася і Пінская зямля, бо ў летапісе сказана, што сын Гедзіміна Нарымонт-Глеб быў тут князем[33]. Але гэта вельмі праблематычна, бо ў іншых летапісах пра гэтага князя гаворыцца зусім іншае[34]. Трэба таксама памятаць аб тым, што Пінск адыграў важную ролю ва ўтварэнні Вялікага княства

Літоўскага: яго войска ў 1268 г. удзельнічала ў заваяванні Войшалкам Літвы[36].

Можна больш-менш упэўнена гаварыць, што межы беларускіх земляў, якія аб'ядналіся ў Вялікім княстве Літоўскім, у гэты час цягнуліся ад Дняпра на ўсходзе да Буга на захадзе, ад межаў Пскоўскага княства на поўначы да межаў Валынскага і Кіеўскага княстваў на поўдні. Праўда, у «Хроніцы Быхаўца» пад 1321 г. змешчана вельмі дэталёвае апавяданне аб паходзе Гедзіміна на гэтыя землі і далучэнні іх да сваіх уладанняў[36]. Але гэта даволі пераканаўча абвергнуў В. Антановіч[37].

Такое становішча беларускіх земляў, у прыватнасці, іх больш ранняе злучэнне ў параўнанні з іншым усходне-славянскім абшарам, дало ім значныя перавагі. Найперш гэта забяспечыла ім дамінуючае значэнне ў Вялікім княстве Літоўскім. Менавіта беларускія землі вызначылі яго ўнутраную і знешнюю палітыку, што яскрава і выявілася ў дзяржаўнай дзейнасці Гедзіміна. Ужо тое, што ён перанёс сталіцу ў Вільню, якая з'яўлялася пераважна крывіцкім горадам, яскрава падкрэслівала, чыімі інтарэсамі ён будзе кіравацца найперш у сваёй дзейнасці.

Калі аб'яднанне беларускіх земляў адбывалася мірна, то ўваходжанне ў склад дзяржавы балцкалітоўскіх земляў па-ранейшаму праходзіла шляхам іх гвалтоўнага далучэння. Як у свой час Міндоўг выгнаў літоўскіх князёў, калі ён «зане Литву», як Войшалк, які пагалоўна вынішчаў ворагаў сваіх пры заваяванні Літвы, Дзяволтвы і Нальшчанаў, як Трайдзень распраўляўся з нальшчанскімі феадаламі, як Віцень вёў барацьбу з Жамойцкай знаццю, якая не прызнавала яго ўлады, схіляючыся да саюза з Ордэнам, так і Гедзімін фактычна пачаў сваю дзейнасць з барацьбы з тымі ж самымі жамойтамі, што па-ранейшаму супраціўляліся вялікакняскай уладзе і знаходзілі падтрымку ў крыжакоў[38].

Гедзімін, як і ўсе яго папярэднікі на вялікакняскім пасадзе, таксама заваёўваў балцкія землі. Таму зразумела, чаму, як яшчэ зазначаў В. Антановіч, літоўцы (у сучасным значэнні гэтага слова) так варожа адносіліся да вялікакняскай дынастыі[39]. Прычына ў тым, што дынастыя гэтая была ім чужой.

На фоне такіх фактаў вельмі ўжо непераканаўча гучаць сцверджанні аб Вялікім княстве Літоўскім як

літоўскай дзяржаве, што ўтварылася ў выніку заваявання літоўскімі князямі беларускіх і іншых славянскіх земляў. Усё, як мы бачылі, адбывалася наадварот. Таму не можа быць гаворкі ні аб Вялікім княстве Літоўскім як літоўскай дзяржаве (таксама ў сучасным значэнні гэтага слова), ні аб тым, што вялікія літоўскія князі былі выразнікамі інтарэсаў літоўскіх феадалаў, бо апошнія ўвесь час супраціўляліся ўтварэнню Вялікага княства і з'яўляліся ворагамі гэтага гістарычнага працэсу.

Але хаця ўваходжанне беларускіх земляў у склад Вялікага княства Літоўскага і было мірным, яго нельга ўяўляць ідылічным. Гэтыя землі не столькі падначальваліся вярхоўнай уладзе, колькі навязвалі ёй патрэбную ім палітыку. Гэта і давала ім у межах дзяржавы шырокую аўтаномію, а таксама магчымасць ажыццяўлення ранейшых мэт, якіх яны не маглі б дасягнуць, калі былі раз'яднанымі. Сказанае найперш адносіцца да найбольш буйнай і развітай складовай часткі Вялікага княства Літоўскага — Полацкай зямлі.

Аднаўленне Полацкай палітыкі ў адносінах да Пскова і Ноўгарада

Раней ужо гаварылася аб паступовым узвышэнні Полацкай зямлі ў новай дзяржаве, якое пачалося з 80-х гг. XIII ст. і знайшло яскравае выяўленне пры Гедзіміне. Менавіта інтарэсы Полацка найперш і вызначалі дзяржаўную палітыку гэтага князя. Як вядома, Полацк на працягу ўсёй ранейшай сваёй гісторыі быў у непрыязных адносінах са сваімі паўночнымі суседзямі — Псковам і Ноўгарадам, якіх ён імкнуўся падначаліць сабе. Ужо першы вядомы нам полацкі князь Рагвалод нападаў на Наўгародскія валасці, чым і быў выкліканы паход наўгародскага князя Уладзіміра Святаслававіча ў 980 г. на Полацк[40]. У 1021 г. князю Брачыславу Ізяслававічу ўдалося нават здабыць

Ноўгарад. У 1065 г. Усяслаў Чарадзей ваяваў супроць Пскова і таксама часова захапіў Ноўгарад. Узнаўлялася гэтая варожасць і на працягу XII ст. У наступным дзесяцігоддзі яна заціхла з прычыны сумеснай барацьбы Полацка, Пскова і Ноўгарада з крыжакамі, але ў канцы XIII ст. зноў аднавілася, сведчаннем чаго можа быць паход «літвы» на Ловаць, г. зн. на Наўгародскую зямлю. Вядома ж, ён, як і ўсе набегі «літвы» на гэтую, а таксама на Пскоўскую і Смаленскую землі ў першай палове XIII ст., быў арганізаваны Полацкам.

Аднак у часы Гедзіміна гістарычныя абставіны для правядзення ранейшай палітыкі, найперш у адносінах да Пскова і Ноўгарада, намнога змяніліся. З аднаго боку, аб'яднанне асноўнай масы беларускіх земляў дало магчымасць полацкай палітыцы перарасці ў агульнадзяржаўную. З другога боку, у гэты час Пскоў і Ноўгарад ужо не былі цалкам самастойнымі, а ўсё больш уцягваліся ў арбіту палітычнага прыцягнення Маскоўскага княства. Вось чаму полацка-наўгародская і полацка-пскоўская супярэчнасці менавіта тады і перараслі ў міждзяржаўныя супярэчнасці Беларускай дзяржавы (якою найперш было Вялікае княства Літоўскае) і Маскоўскага княства, хаця дасюль іх узаемаадносіны былі мірнымі, што знайшло сваё выяўленне ў шлюбе маскоўскага князя Сімяона Іванавіча з дачкой Гедзіміна Анастасіяй[41].

Што да адносінаў з Псковам, дык трэба зазначыць, што ён сам імкнуўся вызваліцца з-пад залежнасці ад Ноўгарада, спадзеючыся ў гэтым абаперціся на дапамогу Вялікага княства Літоўскага. Апроч таго, Пскоў цярпеў ад нападаў крыжакоў, і гэта змушала яго звяртацца да суседняй дзяржавы, якая таксама вяла зацятую барацьбу з крыжакамі. Цяжкасці Пскова з мэтаю прыцягнення яго пад сваю ўладу і выкарыстоўваў Гедзімін. Ён заўсёды пасылаў пскоўцам на дапамогу свайго зяця Давыда Гарадзенскага. У літаратуры ёсць сцверджанне, што апошні нібыта быў сынам пскоўскага князя Доўманта[42], і што пасля смерці яго быў абраны князем Пскова, хоць па незразумелых прычынах чамусьці пайшоў на бацькаву радзіму (Доўмант быў родам з Беларусі), але пскоўцы па-ранейшаму бачылі ў ім свайго князя і таму клікалі яго да сябе на выручку ў цяжкія моманты. Аднак усё гэта не пацвярджаецца крыніцамі, і, найперш, пскоўскімі летапісамі. Найверагодней, што Давыда Гарадзенскага пасылалі пскоўцам на дапамогу ў барацьбе з крыжакамі як умелага военачальніка. Упершыню гэта адбылося ў 1322 г. Крыжакі, нягледзячы на перамір'е, учынілі на Чудскім возеры дзікі гвалт над пскоўскімі людзьмі. Для помсты чужынцам і быў пакліканы Давыд Гарадзенскі. На чале свайго беларускага войска і пскоўскага апалчэння ён уварваўся за р. Нарву ў крыжацкія ўмацаванні, нанёс ім цяжкі ўрон і з багатай здабычай і пяццю тысячамі палонных вярнуўся ў Пскоў[43]. Вядома ж, крыжакі не маглі пакінуць такую ганебную для іх паразу без адказу і 11 мая 1323 г. зноў напалі на Пскоў. І гэтым разам дапамог Давыд Гарадзенскі, які адагнаў ворага, знішчыўшы яго сценабітныя машыны і іншае ўзбраенне[44]. Новая перамога была асабліва важная для Пскова, бо Ноўгарад чамусьці не прыйшоў яму на дапамогу.

На жаль, разлічваць на Давыда Гарадзенскага пскоўцы больш не маглі. У 1325 г., у час паходу на чале вялікага войска супроць Брандэнбурга, ён быў па-здрадніцку забіты мазавецкім рыцарам Андрэем. Так трагічна абарвалася жыццё гэтага славутага сына Беларусі, які стаіць у шэрагу самых выдатных палкаводцаў свету.

Смерць Давыда Гарадзенскага была выкарыстана Гедзімінам у сваіх інтарэсах. Лічачы сябе спадкаемцам свайго зяця, ён стаў прэтэндаваць на валоданне Псковам як сваёй законнай спадчынай. У пэўнай ступені гэта было выгадна і для Пскова, якому выпадала магчымасць выйсці з-пад улады Ноўгарада, што яму, відаць, здавалася горшай, чым улада Гедзіміна.

Першыя супярэчнасці з Масквой

Тым часам на гістарычнай арэне з'явілася новая сіла — Маскоўскае княства. Менавіта тады і пачалося яго ўзвышэнне, асабліва калі маскоўскім князем стаў сучаснік Гедзіміна Іван Каліта (ён

памёр на год раней за літоўскага ўладара. Пры Каліце пачынае фарміравацца і ажыццяўляцца дзяржаўная канцэпцыя Масквы як законнага гаспадара ўсіх рускіх земляў, у тым ліку, вядома, і Наўгародскай, і Пскоўскай.

Іван Каліта не мог не бачыць, што Масква ўжо трохі запазнілася з клопатам пра збіранне рускіх земляў і што гэтая дзейнасць пачалася ўжо на заходніх рускіх землях, тыя аб'ядналіся ў адзінай дзяржаве, што ўсё больш разрасталася на ўсход, пагражаючы пашыраць сваю ўладу на Пскоў і Ноўгарад. Гэта таксама не схавалася ад пільнага вока Івана Каліты. Да таго ж згаданыя рускія землі ўжо самі сталі адчуваць сілу Масквы і таму шукалі ў яе падтрымкі.

Вось жа Ноўгарад, убачыўшы імкненне Пскова вызваліцца з-пад яго ўлады, і звярнуўся па дапамогу да Івана Каліты, які і даў зразумець, што ён не пацерпіць умяшання Гедзіміна ў справы Пскова і стане на бок Ноўгарада. Як бачна, калі ў ранейшыя часы Полацк меў справу толькі з Псковам і Ноўгарадам як са сваімі праціўнікамі, то Вялікае княства Літоўскае як пераемнік Полацкай палітыкі ў адносінах да гэтых земляў стала мець справу не толькі з імі, але (і галоўным чынам) з Масквой. Так пачаліся беларуска-маскоўскія супярэчнасці, якія ў далейшым і стануць адным з найгалоўнейшых і найбольш адмоўных фактараў гісторыі Беларусі.

Нягледзячы на першую няўдачу, Гедзімін не спыніў сваёй палітыкі ў адносінах да Пскова. Але калі раней ён дамагаўся гэтага горада і яго валасці як сваёй спадчыны, то цяпер выкарыстаў цвярскога князя Аляксандра Міхайлавіча, які трапіў тады ў складаную палітычную сітуацыю за дзеянні супроць татараў. Выгнаны са свайго пасаду Іванам Калітой па патрабаванні Арды, ён вымушаны быў уцякаць у Пскоў, дзе яго прыязна прынялі і выбралі за князя (гэтаму садзейнічаў і Гедзімін). Усё тое зноў-такі было не даспадобы Ноўгараду, які бачыў тут спробу адасаблення ад яго Пскова. І наўгародцы зноў знайшлі дапамогу ў Маскве, адкуль да іх з войскам прыйшоў Іван Каліта. Ды не толькі ён, але і маскоўскі мітрапаліт Феагност, на што трэба звярнуць асаблівую ўвагу, бо гэта паказвае, якой надзейнай духоўнай зброяй у руках маскоўскіх князёў была праваслаўная царква.

Даведаўшыся, што Іван Каліта хоча ісці з Ноўгарада на іх, пскоўцы заявілі пра свой намер абараняць горад да канца. Гэта напалохала Івана Каліту, і ён звярнуўся да мітрапаліта Феагноста з просьбаю: калі горад не адмовіцца ад Аляксандра Міхайлавіча, застрашыць пскоўцаў пракляццем. Мітрапаліт так і зрабіў. Аляксандр Міхайлавіч мусіў пакінуць Пскоў і знайсці прыстанішча ў Гедзіміна. І гэта зразумела. Гедзімін праз сваю прыхільнасць да Аляксандра Міхайлавіча дэманстраваў зацікаўленасць лёсам Пскова. І калі Іван Каліта са сваёй дружынаю вярнуўся з Ноўгарада ў Маскву і заняўся іншымі справамі, якія адцягвалі яго ўвагу ад Пскова, то, прабыўшы паўтара года ў Вялікім княстве Літоўскім, Аляксандр Міхайлавіч па просьбе пскоўцаў і, вядома ж, з дапамогай Гедзіміна, зноў вярнуўся ў гэты горад[45].

Але гэтага, каб уцягнуць Пскоў у залежнасць, для Гедзіміна было яўна недастаткова. Мітрапаліт Феагност зноў выходзіць на першы план у справе ўтрымання Пскова пад уладаю Ноўгарада, а тым самым і пад уладаю Масквы. Рэч у тым, што Пскоў, не маючы свайго епіскапа, залежаў ад наўгародскага ўладыкі. А ў той час, як мы ўжо ведаем, з прыкладу таго ж Феагноста, царкоўная ўлада як найлепш мацавала ўладу палітычную. Вось чаму без выхаду з-пад царкоўнай улады Ноўгарада (гэта магло адбыцца толькі ў выніку атрымання свайго епіскапа) Пскоў не мог канчаткова пазбавіцца залежнасці ад яго. Гэта добра разумеў і Гедзімін. У 1331 г., па ўсім відаць, не без ініцыятывы самога вялікага князя, калі мітрапаліт Феагност быў у Ноўгарадзе-Валынскім, пскоўцы звярнуліся да яго з просьбаю даць ім у епіскапы манаха Арсенія. Мітрапаліт добра ведаў, чым гэта можа скончыцца, і таму рашуча адмовіў.

Няўдача палітыкі Гедзіміна ў адносінах да Пскова, як бачна, была найперш вынікам шчыльнай сувязі апошняга з Ноўгарадам, якому таксама на працягу стагоддзяў супрацьстаяў Полацк. Таму зразумела, што ўзаемаадносіны з Псковам арганічна перарасталі ва ўзаемаадносіны з Ноўгарадам і вызначалі іх характар. Ноўгарад не выпускаў з-пад сваёй улады Пскоў, абапі-

раючыся на Маскву. І ў той жа час, ён не хацеў апынуцца пад яе ўладай сам, а таму ішоў на саюз з Вялікім княствам Літоўскім.

Вось гэтую супярэчнасць становішча Ноўгараду і выкарыстоўваў у сваіх інтарэсах Гедзімін, асабліва калі абвастраліся наўгародска-маскоўскія адносіны.

У 1333 г. Іван Каліта на адмову Ноўгарада аддаць яму «закамскае срэбра», захапіў падуладныя наўгародцам Таржок і Бежацкі Верх. І вось Ноўгарад, каб паказаць сваю моцную апору, бярэ да сябе Гедзімінавага сына Нарымонта-Глеба і аддае яму ў кармленне Ладагу, Арэхавец, Карэльскую зямлю і палову Капор'я[46]. Гэта паказала Івану Каліце, хто з'яўляецца яго галоўным праціўнікам у справе збірання вакол Масквы рускіх земляў. У выніку адносіны паміж дзяржавамі абвастрыліся, і Іван Каліта сабраўся ісці супроць Гедзіміна вайною. Апошні не мог не разумець усёй небяспекі гэтага, ведаючы, што за спіной Масквы стаіць дапамога Арды, і таму пастараўся кончыць справу мірам, падмацаваўшы яго шлюбам сваёй дачкі Аўгусты з сынам Івана Каліты Сімяонам. З свайго боку, і Іван Каліта пайшоў Ноўгараду на ўступкі, адмовіўшыся ад ранейшых патрабаванняў. Трэба зазначыць, што прыняцце Нарымонта ў Ноўгарад таксама не дало патрэбных вынікаў для Гедзіміна. Баючыся Масквы, Ноўгарад не хацеў падпасці і пад уладу Вялікага княства Літоўскага і аддаць яму частку сваёй тэрыторыі. Таму ён дыпламатычна перадаў Нарымонту тыя землі, якія не межаваліся з Княствам. Зразумела, Нарымонт не мог быць вельмі зацікаўленым у гэтым, і большую частку жыцця правадзіў на радзіме, пакінуўшы на наўгародскіх землях сына Аляксандра. А калі ў 1337 г. на гэтыя землі напалі шведы, ён, не жадаючы ваяваць з імі, назаўсёды з сваім сынам вярнуўся на радзіму.

Аднак гэтымі няўдачамі не закончылася для Вялікага княства Літоўскага барацьба за Пскоў і Ноўгарад. Гэта быў толькі пачатак аднаўлення традыцыйнай полацкай палітыкі.

Узаемаадносіны з Рыгай і Ордэнам

Але не толькі пскоўска-наўгародскімі справамі Полацка павінен быў займацца Гедзімін. Адначасова не меншую ўвагу ён быў змушаны ўдзяляць і яшчэ больш важнаму клопату Полацка — яго барацьбе з крыжакамі. І гэта зразумела, бо калі ў першым выпадку Полацк наступаў, то ў другім — абараняўся ад свайго найбольш небяспечнага ворага. З пачатку XIII ст., захапіўшы ў Полацка Ніжняе Падзвінне, крыжакі не спынілі далейшага націску на крывіцкую зямлю, робячы на яе рабаўнічыя набегі і беручы ў палон яе людзей. Усё гэта знясільвала Полацкую зямлю. Абарона Полаччыны, якая з'яўлялася важнейшай складовай часткаю Вялікага княства Літоўскага як у эканамічных, так і ў культурных адносінах, станавілася галоўнай задачай дзяржавы, што і знаходзіла выяўленне ў дзейнасці Гедзіміна.

Наколькі князя непакоілі беды, што прыносілі крыжакі Полацкай зямлі, сведчыць яго пасланне біскупам Дэрпцкаму, Эзэльскаму, дацкаму намесніку Рэвельскай зямлі і Радзе г. Рыгі ад 22 верасня 1324 г. Вось красамоўнае сведчанне таго, што тварылі крыжакі: уварваўшыся «ў зямлю полацкую, яны яе варожа разарылі, людзей і коней захапілі... таксама роўна 40 дзён пасля гэтага яны зноў, як драпежныя варвары, жорстка спустошылі тую зямлю, бязлітасна забілі 80 людзей, а некаторых павялі з сабою разам з 50 коньмі, адзеннем і іншым дабром»[47]. Трэба думаць, што пасланне Гедзіміна і прынятыя ім захады аб спыненні такіх дзеянняў з боку лівонцаў мелі вынікі.

Крыжацкая пагроза для Полацка ішла непасрэдна з боку Лівонскага ордэна, паміж якім, з аднаго боку, і з рыжскім архібіскупам і магістратам Рыгі, з другога ўжо доўгі час існавала ўзаемная варожасць. Гэтую акалічнасць і выкарыстаў Гедзімін: ён стаў на бок Рыгі, што дыктавалася інтарэсамі Полацка, для якога выгадна было трымаць гандлёвыя сувязі з Рыгай. Немалаважным было і тое, што гэта намнога аслабляла пазіцыю Лівонскага ордэна і змушала яго на заключэнне міру, што найперш ішло на карысць таксама Полацка.

Апроч таго, Гедзімін імкнуўся выклікаць з еўрапейскіх краін у сваю дзяржаву каланістаў, найперш рознага роду рамеснікаў, якія б пашыралі сваё высокае майстэрства і культуру сярод насельніцтва Вялікага княства Літоўскага[48]. Трэба зазначыць, што тут Гедзімін браў прыклад з Полацка, які ўжо з даўніх часоў меў цесныя сувязі з Захадам, заключаў з Рыгаю гандлёвыя ўмовы. У выніку ў галоўным горадзе крывічаў і ў іншых цэнтрах яго зямлі жыло нямала выхадцаў з заходніх краін, што садзейнічала больш высокаму ўзроўню яго культуры ў параўнанні з іншымі землямі Вялікага княства Літоўскага. Усё гэта не магло застацца па-за ўвагаю Гедзіміна. У 1323 г. ён накіраваў некалькі пасланняў да жыхароў заходніх гарадоў з запрашэннем пераязджаць ў яго дзяржаву, дзе ім будуць забяспечаны выгодныя ўмовы. Рыжскі магістрат паспрыяў вялікаму князю, падрадзіўшыся рассылаць гэтыя пасланні па гарадах, куды яны былі адрасаваныя, і паручыўшыся за іх сапраўднасць. Як бачым, саюз з Рыгай даваў Вялікаму княству значныя выгоды.

Пра што пасведчыў летапіс пад 1326 г.

Палітыка Гедзіміна ў адносінах да Рыгі і Ордэна і прывяла да заключэння ў 1326 г. міру, адначасова і з немцамі, і з Ноўгарадам. Аб гэтым у летапісе зроблены такі запіс: «того же лета приехаша послы из Литвы брат Гедиминов князя литовского воин Полоцкий Василий Менский князь Федор Святославич и доконаша мир с Новгородци и с Немци»[49]. Хаця гэты запіс, як бачым, вельмі лаканічны і таму ў многім таямнічы, аднак ён захоўвае важную для нас інфармацыю. Мы ў свой час ужо разглядалі гэты запіс у сувязі з высвятленнем прыналежнасці названых тут гістарычных асобаў і прыйшлі да высновы, што гаворка ідзе тут не пра трох, як гэта сцвярджалася некаторымі даследчыкамі, а пра двух чалавек: пра полацкага валадара, княжацкае імя якога было Воін, а хрысціянскае — Васілій, і пра менскага князя Фёдара Святаслававіча[50].

Што ж да таго, ці быў Воін-Васілій братам Гедзіміна, як аб гэтым сказана ў летапісе, то адзначым, што ў некаторых іншых крыніцах (летапіс Аўраамкі, Сафійскі I, Ніканаўскі, Васкрасенскі і іншыя летапісы) аб гэтых асобах сказана не «брат», а «братня», гэта значыць, што не толькі Воін-Васілій, але і Фёдар Святаславіч быў братам Гедзіміна. Апошні факт прымушае сумнявацца, ці былі яны абодва братамі Гедзіміна. Як ужо намі адзначалася, у князёў быў звычай называць адзін аднаго братам нават пры адсутнасці сваяцтва. Усё гэта дае важкія падставы сумнявацца ў тым, што Воін-Васілій, а тым болей Фёдар Святаслававіч, былі братамі Гедзіміна.

Але найбольшую цікавасць у высвятленні асобы Воіна ўяўляе тое, што адзначанае летапіснае паведамленне — адзінае сведчанне пра гэтага князя. І тут паўстае пытанне: калі ён пачаў княжыць у Полацку? У свой час В. Данілевіч меркаваў, што Воін мог стаць полацкім князем толькі пасля смерці Віценя, які, маўляў, у 1307 г. захапіў Полацк і, далучыўшы яго да сваіх уладанняў, не даў яму асобнага князя, пра што нібыта сведчыць грамата епіскапа Якава[51]. Мы ўжо казалі пра выдуманасць полацкіх падзей, якія нібыта адбываліся ў 1307 г.[52]. Віцень не мог заваёўваць Полацк, бо ў гэтым не было патрэбы, паколькі Полацкая зямля ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага яшчэ ў 60-х гг. XIII ст. пры Войшалку. Тое, што Полацкая грамата была пасланая ў Рыгу ад імя епіскапа, яшчэ не гаворыць аб адсутнасці ў Полацку князя. Епіскап падпісваў граматы і тады, калі ў Полацку быў князь, як гэта мы бачым у 1338 г.[53]. Такім чынам, час пачатку княявання Воіна ў Полацку для нас застаецца зацемненым, але імя яго яскрава сведчыць, што ён належаў да полацкай дынастыі, якая, як бачна, прадаўжала панаваць у сваёй спадчыннай зямлі, у той час як ва ўсёй дзяржаве панавала яе віленскае адгалінаванне.

Паказальна таксама і ўпамінанне менскага князя. На працягу амаль 170 гадоў з часу, калі ён вёў міжусобную барацьбу з Полацкам, у 50—60-х гг. XII ст., Менск быў знік з нашых летапісаў, і мы нічога не ведаем аб яго гісторыі ў гэты час. І вось, як выяўляецца, Менск не толькі не занепаў у сваім развіцці, але і захаваў свой удзел, а гэта значыць, што ён меў значную

палітычную вагу ў дзяржаве, да якой належаў. Пра гэта сведчыць і важнае дзяржаўнае даручэнне, што выконваў менскі князь.

Менавіта пасольская місія полацкага і менскага князёў уяўляе для нас найбольшую цікавасць. Вядома ж, такое даручэнне гэтым князям не было выпадковым. Папершае, мы маем яскравае сведчанне таго, хто выконваў дыпламатычныя даручэнні Гедзіміна — прадстаўнікі беларускіх земляў. Па-другое, гэта адначасова сведчыць, што ў міры з Ноўгарадам і немцамі былі найперш зацікаўлены Полацкая і Менская землі. Мір падпісваўся адначасова з двума праціўнікамі, і гэта забяспечвала на пэўны час знешнюю бяспеку.

І хрысціянства, і язычніцтва

У гістарычнай літаратуры пануе думка, што Вялікае княства Літоўскае да Крэўскай уніі было язычніцкай дзяржавай і што, натуральна, яе ўзначальвалі вялікія князі-язычнікі. Аднак такое сцверджанне, як і шэраг іншых, што датычыць гісторыі гэтай дзяржавы, з'яўляецца вынікам тэндэнцыйнасці даследчыкаў, якія наўмысна не ўлічвалі відавочныя гістарычныя факты.

Як можна гаварыць аб Вялікім княстве Літоўскім як язычніцкай дзяржаве, прынамсі, да Крэўскай уніі, калі ўжо першай яе сталіцаю стаў праваслаўна-хрысціянскі Новагародак, а яе першы вялікі князь Міндоўг, перш чым заняць свой пасад, павінен быў у 1246 г. разам са сваімі баярамі прыняць «веру Христову от Востока»[54] (г. зн. праваслаўе). У 1252 г. ён з палітычных мэт прымае каталіцкую веру і каралеўскую карону ад рымскага папы[55]. Другі вялікі князь Войшалк — сын Міндоўга — быў, як вядома, настолькі адданы праваслаўю, што прыняў манаскі чын і заснаваў манастыр[56]. Свой вялікакняскі пасад Войшалк перадаў праваслаўнаму Шварну — сыну Данілы Галіцкага[57]. Не мог быць язычнікам і наступны вялікі князь Трайдзень, хаця ён такім і характарызуецца ў Галіцка-Валынскім летапісе, а адсюль

і ў гістарычнай літаратуры. Як мы ўжо зазначалі, ён не мог быць язычнікам і тым больш літоўцам, бо меў славянскае імя, як, дарэчы, і яго чатыры браты, што паводле таго ж Галіцка-Валынскага летапісу, з'яўляліся хрысціянамі. У той час існавала завядзёнка называць бязбожнікамі, паганымі, язычнікамі ўсіх сваіх ворагаў, незалежна ад веравызнання. Яскравы прыклад — Трайдзень, які зацята ваяваў з галіцка-валынскімі князямі, і атрымаў ад іхняга летапісца адпаведную характарыстыку. Ды зноў-такі праваслаўны Новагародак, асабліва калі ўлічыць, што перад гэтым тут княжыў надзвычай шчыры праваслаўны Войшалк, не пацярпеў бы на сваім пасадзе язычніка. А ці мог Віцень, будучы язычнікам, увесці дзяржаўны герб — «Пагоню», дзе на шчыце «збройнага» рыцара была выява крыжа?[58] Невыпадкова таксама ж тое, што полацкі епіскап Якаў называў Віценя «сынам сваім»[59].

Пасля прыведзеных відавочных фактаў наўрад ці можна гаварыць, што Гедзімін быў язычнікам, і што ён быў «першы з літоўскіх вялікіх князёў, якія зразумелі неабходнасць прыняцця хрысціянства»[60]. Аднак менавіта ў сувязі з Гедзімінам і найбольш сцвярджаецца аб перавазе язычніцтва ў Вялікім княстве Літоўскім. Што ж з'явілася падставай для такога погляду. Гэтаму садзейнічала некалькі акалічнасцяў. Найперш успрыняцце Княства як краіны, дзе дамінавала язычніцтва, ішло з Ордэна і Рыгі, паколькі яны межаваліся з Жамойціяй, што сапраўды была язычніцкай. Дзякуючы гэтаму і стваралася ўражанне, нібыта язычніцтва пануе ва ўсім Вялікім княстве Літоўскім, а Гедзімін — кароль язычнікаў, што і знайшло адбіццё ў нямецкіх хроніках.

Аднак гэта зусім не адпавядае сапраўднасці. Жамойція і іншыя балцка-літоўскія землі складалі ў дзяржаве значна меншую частку абшару ў параўнанні з беларускімі, якія дамінавалі ў ёй, і насельніцтва якіх было ў цэлым хрысціянска-праваслаўным. І таму паўстае пытанне: ці магло яно падначальвацца вялікаму князю-язычніку?

Але найбольш важным аргументам на карысць перавагі язычніцтва ў Вялікім княстве Літоўскім з'яўляецца шэраг дакументаў 1322—1324 гг., якія нібыта сведчаць аб намеры Гедзіміна ахрысціць сваю дзяржаву ў каталіцкую веру. І сапраўды аб гэтым сведчыць пасланне